УДК 323.329 (476)(091)

А. Г. Каханоўскі, дацэнт БДУ

# ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ БЕЛАРУСІ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.: ДЭФІНІЦЫІ, ЭТАПЫ І АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ

There are analysis of the definitions of the term «intelligentsia» in the article. Here are separated and characterized the most important stages in the intelligentsia's becoming in Belarus in XIX – the beginning of the XX ct. There are denoted specific features of this process. Special attention are given to the definition of limits and tasks of the Belarusian intelligentsia in the end of the XIX – the beginning of the XX century.

Тэма гісторыі інтэлігенцыі Беларусі неаднаразова прыцягвала ўвагу даследчыкаў. Выказвалася неабходнасць комплекснага асэнсавання праблемы, зроблены пэўныя зрухі ў даследаванні асобных прафесійных груп асоб пераважна разумовай працы, якіх пры адпаведным разглядзе можна аднесці да інтэлігенцыі, але мы так і не наблізіліся да цэласнага разумення гэтай з'явы, дасканала не адказалі на многія пытанні, у тым ліку не акрэслілі гістарычны шлях станаўлення інтэлігенцыі Беларусі, яе адметныя рысы.

Для краін Усходняй Еўропы адной з найбольш непазнаных з'яў лічыцца ўзнікненне і функцыянаванне ўласнай інтэлігенцыі. Яе акрэсленне як сацыяльнай групы і прадмета даследавання адносіцца да ліку тых, што з цяжкасцю паддаюцца вызначэнню. Ад самага пачатку выкарыстання тэрміна «інтэлігенцыя» ў дачыненні пэўнай групы людзей узніклі спрэчкі аб яе межах і выконваемых функцыях. Часта пад інтэлігенцыяй разумелі сацыяльна-прафесійную групу насельніцтва, якая вылучалася пэўным узроўнем адукацыі і прыналежнасцю да асоб пераважна разумовай працы. Больш рэдка межы і задачы інтэлігенцыі акрэсліваліся вузка: яна ўспрымалася як супольнасць носьбітаў вынікаў адукаванасці, культуры, грамадзянскай свядомасці ў народ, выканаўцаў культурна-гістарычнай і маральнай місіі. У першым выпадку сфармулявана ўяўленне аб інтэлігенцыі большасці грамадства, у другім – пераважна самаўяўленне аб сабе і сваіх задачах прадстаўнікоў самой інтэлігенцыі. У апошнім варыянце самаўяўленне інтэлігенцыі прадугледжвае мноства значэнняў, што істотна ўскладняе выяўленне межаў прадмета даследавання. Найбольш актыўна і востра праблемы вызначэння і развіцця інтэлігенцыі распрацоўваліся ў расійскай дарэвалюцыйнай і постсавецкай навуковай і публіцыстычнай літаратуры.

Тэрмін «інтэлігенцыя» ў рускай мове мае мноства значэнняў – ацэначных і шматсэнсоўных, якія фарміраваліся пад уплывам канкрэтнай гістарычнай і сацыяльнай сітуацый уваходжання яго ва ўжытак. Першапачаткова гэты тэрмін ужывалі ў Расіі як філасофскую катэгорыю. З 60-х гг. XIX ст. слова «інтэлігенцыя» стала абазначаць частку грамадства і адразу было напоўнена супярэчлівым зместам. Пад інтэлігенцыяй разумелася «культурная», «цывілізаваная» сацыяльная група з адпаведным узроўнем адукацыі. Да яе адносілі нярэдка і чыноўнікаў. Менавіта ў такім сэнсе гэта катэгорыя была выкарыстана ў апублікаваных дзённіках міністра ўнутраных спраў Расіі П. Валуева і прафесара літаратуры А. Нікіценкі. Блізкім быў пункт гледжання вядомага публіцыста Д. Аўсяніка-Кулікоўскага [5, 5]. У якасці асоб разумовай працы ўспрымалі інтэлігенцыю большасць расійскіх народнікаў і марксістаў. Многімі публіцыстамі адзначалася, што інтэлігенцыя з'яўляецца спецыфічнай рысай славянскага грамадства. Кансерватыўная частка дваранства лічыла інтэлігенцыю людзьмі недастаткова выхаванымі, ніжэйшага стану [4, 5]. У ліберальным асяроддзі інтэлігенцыю атаясамлівалі з прадстаўнікамі «вольных прафесій», разглядалі іх як актыўную і прагрэсіўную частку грамадства, не ахопленую радыкальнымі палітычнымі ідэямі.

У беларускай літаратуры пытанне аб межах і задачах інтэлігенцыі першапачатковы разгляд атрымала ў работах публіцыстаў-народнікаў. У «Лістах аб Беларусі», аўтар якіх выступіў пад псеўданімам Даніла Баравік, ставіўся знак роўнасці паміж інтэлігенцыяй і мясцовымі «лепшымі» людзьмі, прычым за імі замацоўваліся функцыі праваднікa дэмакратычных ідэй і прынцыпаў на карысць народа [6, 29–31]. Д. Баравік лічыў, што інтэлігенцыя павінна быць рухавіком на шляху прагрэсіўнага развіцця народа пры дапамозе сродкаў, якія адпавядалі ўмовам жыцця людзей і дапамагалі хуткаму фарміраванню самасвядомасці і грамадзянскай волі. З гэтага сцвярджэння ён выводзіў асноўную задачу інтэлігенцыі Беларусі – культурна-асветніцкую: перш за ўсё, вывучэнне быта, звычаяў, традыцый, гісторыі народа. У адказ на «Лісты аб Беларусі» ў хуткім часе з'явілася «Пасланне да землякоў-беларусаў», падпісанае псеўданімам Шчыры Беларус. У «Пасланні» падкрэслена карыснасць, але недастатковасць «адных мясцовых

вывучэнняў» [6, 37–39]. На думку аўтара гэтага публіцыстычнага твора, неабходна пазбавіцца ад усіх перашкод, якія стварае расійскае самадзяржаўе на шляху новых ідэй, нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення Беларусі.

Аўтарамі-выдаўцамі «Гомана» – нелегальнага часопіса аднайменнай беларускай народніцкай групы – у якасці цэнтральнай аб'ядноўваючай ідэі інтэлігенцыі была прызнана задача абуджэння этнічнай самасвядомасці, нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення народа. Характэрным для распрацаванай гоманаўцамі ідэі інтэлігенцыі стала наданне першачарговага значэння рэалізацыі ёю нацыянальных задач. «Вялікая і святая задача беларускай інтэлігенцыі, – адзначалася ў першым нумары «Гомана», – разварушыць магутныя сілы свайго народа, накіраваць прыпыненае прагрэсіўнае развіццё яго, даць яму магчымасць праявіць свой нацыянальны геній...» [6, 70].

Больш выразна межы інтэлігенцыі спрабаваў акрэсліць Максім Багдановіч. У сваім артыкуле «Новая інтэлігенцыя» ён адзначаў, што кожны прадстаўнік гэтай сацыяльнай групы павінен адпавядаць двум патра-баванням: папершае, імкнуцца да ведаў, па-другое, несці свае веды на карысць народа. Другое патрабаванне М. Багдановіч лічыў больш істотным [1, 202].

Асвечаную, авангардную частку грамадства далучаў да інтэлігенцыі Ігнат Дварчанін. У «Хрэстаматыі новай беларускай літаратуры» ён адзначаў, што інтэлігенцыя не складае асобнага сацыяльнага класа, а як больш асвечаная частка грамадства аддае веды іншым класам. Паходжанне, выхаванне, асабістая ўдача ў жыцці, абставіны знешняга характару, на думку І. Дварчаніна, рабілі асобных інтэлігентаў прыхільнікамі таго ці іншага класа, выразнікамі яго ідэалогіі. Не адмаўляў ён наяўнасці агульных рыс інтэлігенцыі як асобнай сацыяльнай супольнасці: зацікаўленасць у развіцці роднай мовы, нацыянальнай дзяржаўнасці, уменне разумець і ацэньваць здабыткі культуры, паглыбленасць у свой унутраны свет, вечныя разважанні, пошукі рашэння сусветных праблем і г. д.

Ролю інтэлігенцыі ў грамадска-палітычным жыцці некалькі прыніжаў Зміцер Жылуновіч, аднак у сваім артыкуле «Беларуская інтэлігенцыя ў гістарычным аспекце» ўпершыню прапанаваў ідэю паэтапнага развіцця нацыянальнай інтэлігенцыі, ахарактарызаваў кожны з этапаў, прааналізаваў адносіны інтэлігенцыі да сацыяльнага і нацыянальна-канфесійнага пытанняў. Ён вылучыў наступныя тыпы-этапы беларускай інтэлігенцыі: шляхецкая «дробнабуржуазная», якая выйшла з польскамоўнага культурнага асяродку і была «няблізка» да патрэб беларускага селяніна; народніцкая, паводле вызначэння З. Жылуновіча, «Ф. Багушэвіч і сучасная яму беларуская інтэлігенцыя», якая ўяўляла сабой «папраўленае з боку дэмакратызму выданне той жа дробнашляхецкай інтэлігенцыі»; інтэлігенцыя 90-х гг. XIX ст. – «дзевяцідзесятнікі», якіх Жылуновіч размежаваў на дзве групы – шляхецка-буржуазная галіна (Ядвігін Ш., В. Ластоўскі і інш.) і сацыялістычная плынь (К. Каганец, А. Пашкевіч і інш.) [3, 78–79]. «Дзевяцідзесятнікі» прanяслі на сабе ўвесь цяжар часоў замацавання і афармлення беларускай справы» і «радыкальна» тварам павярнуліся да сялянства. Названыя тыпы інтэлігенцыі паслядоўна змянялі адзін аднаго, а часта і суіснавалі побач. Пад інтэлігеныяй З. Жылуновіч разумеў, перш за ўсё, дзеячоў беларускага нацыянальна-культурнага і вызваленчага руху.

Праблема інтэлігенцыі ў беларускай публіцыстыцы не набыла той вастрыні і актуальнасці, як у расійскай. Прычын гэтай з'яве было некалькі: з аднаго боку, грамадскі рух у беларускіх губернях да пачатку XX ст. не набыў такой дыферэнцыяцыі, як у вялікарускіх; з другога – для інтэлігенцыі Беларусі больш уласцівай была этнічная раз'яднанасць і неабыякавасць да нацыянальнай праблематыкі і пачуццяў, чым дыферэнцыяцыя па сацыяльна-палітычных пазіцыях; трэццяе – па прычыне ўрадавых абмежаванняў у сферы культурна-адукацыйнай дзейнасці на тэрыторыі беларускіх губерняў не склаўся шырокі слой інтэлігенцыі, асоб, прафесійна занятых у інтэлектуальнай галіне дзейнасці.

Грамадска-палітычныя падзеі XIX – пачатку XX ст., змены ва ўрадавай палітыцы, спробы трансфармаваць сацыяльную структуру грамадства Беларусі да агульнарасійскага стандарта вызначылі этапы і асаблівасці фарміравання мясцовай інтэлігенцыі. Адна з галоўных спецыфічных рыс, што паставіла пад сумненне непарыўнае развіццё інтэлігенцыі Беларусі, – страта фізічнай і часам духоўнай пераемнасці паміж рознымі пакаленнямі гэтай групы. Прычынамі такой з'явы сталі паўстанні, актывізацыя нацыянальна-вызваленчага руху і рэпрэсіі ў дачыненні іх удзельнікаў. Апошнімі вельмі часта станавіліся прадстаўнікі творчай эліты, студэнцкая і вучнёўская моладзь. Хто пазбягаў арышту, вымушаны былі эміграваць у краіны Заходняй Еўропы. Акрамя таго, неспрыяльныя ўмовы развіцця нацыянальнай культуры абумовілі яшчэ адну асаблівасць развіцця інтэлігенцыі Беларусі. Яна стала донарам развіцця культур суседніх народаў, што прывяло фактычна да страты значнай часткі ўласнай эліты, збяднення інтэлектуальнага жыцця. Былы філаматавец, удзельнік паўстання 1830–1831 гг. І. Дамейка (1802–1889) эмігрыраваў у

Францыю, а затым па запрашэнню ўрада выехаў у Чылі і зрабіў істотны ўклад у вывучэнне геалогіі і мінералогіі гэтай краіны. Урад Чылі абвясціў Дамейку нацыянальным героем краіны. Другі філаматавец В. Кавалеўскі (1800–1878), які быў высланы за ўдзел у студэнцкіх тайных арганізацыях, стаў адным з пачынальнікаў расійскага ўсходазнаўства, рэктарам Казанскага універсітэта. Галоўнай працай яго жыцця стала першае выданне трохтомнага «Мангольска-руска-французскага слоўніка». Першай у свеце жанчынай-прафесарам стала С. Кавалеўская (1850–1891), якая паходзіла з беларускага шляхецкага роду. Яна стала прафесарам матэматыкі ва універсітэце Стакгольма. Ураджэнцы Беларусі Адам Міцкевіч і Уладзіслаў Сыракомля сталі класікамі польскай літаратуры. Адзін з пачынальнікаў народніцкага руху ў Беларусі Мікалай Судзілоўскі, вымушаны эміграваць, стаў пазней першым кіраўніком Гавайскай рэспублікі. Продкамі класіка рускай і сусветнай літаратуры Фёдара Дастаеўскага былі шляхціцы Пінскага павета. Вядомы расійскі географ Мікалай Пржэвальскі і класік французскай літаратуры Гіём Апалінэр таксама звязаны сваім паходжаннем з беларускай зямлёй. Інтэлігенцыя Беларусі характарызавалася шматнацыянальнасцю свайго складу, прычым, у параўнанне з многімі іншымі народамі Еўропы, тытульная нацыянальная інтэлігенцыя складала адну з груп і меншасць сярод мясцовай інтэлігенцыі.

Першая трэць XIX ст. вызначылася пanaваннем польскіх грамадска-культурных уплываў у Беларусі. Палітыка імператараў Паўла I і Аляксандра I па аднаўленню мясцовых традыцый, часам вельмі паспешлівая, адсутнасць мэтанакіраванай палітыкі на далучаных ад Рэчы Паспалітай беларускіх землях прывялі да больш інтэнсіўнай паланізацыі сферы адукацыі, грамадскага жыцця і нават судова-адміністрацыйнага апарату, чым гэта было ў XVIII ст. Распаўсюджванню польскіх уплываў значна дапамагла дзейнасць адміністрацыі Віленскай навучальнай акругі [2, 293–297]. Спроба імператара Мікалая I у першыя гады свайго кіравання змяніць сітуацыю адчувальных вынікаў не дала. Інтэлектуальнае жыццё Беларусі, акрамя абазначанай тэндэнцыі, характарызавалася непасрэднай пераемнасцю, захаваннем духоўнай сувязі з папярэднім перыядам культурнага развіцця канца XVIII ст. Прафесары Віленскага універсітэта М. Баброўскі, І. Даніловіч паклалі пачатак збіранню і вывучэнню помнікаў беларускага пісьменства XVI–XVII ст. Яны садзейнічалі абуджэнню цікавасці да гісторыі, культуры, вуснай народнай творчасці беларусаў студэнтаў-сяброў таварыстваў філаматаў і філарэтаў, перш за ўсё Я. Чачота, Т. Зана і інш. Беларуская інтэлегенцыя таго часу фарміраваліся пераважна з выхадцаў з духавентва і збяднелай шляхты.

Пасля падаўлення паўстання 1831 г. праявіла сябе тэндэнцыя паступовага перамяшчэння цэнтраў фарміравання інтэлігенцыі па-за межы Беларусі. Імі сталі, перш за ўсё, вышэйшыя навучальныя ўстановы і грамадска-культурныя аб'яднанні Санкт-Пецярбурга і Масквы, а таксама краін Заходняй Еўропы. Больш выразнай гэта акалічнасць стала пасля паўстання 1863 г., і толькі актывізацыя нацыянальна-культурнага жыцця ў пачатку XX ст. (выданне «Нашай нівы» і інш.) істотна зменшыла яе ролю. Творчасць і погляды інтэлігенцыі гэтага часу не заўжды мелі акрэслены нацыянальны змест; найперш заўвага тычыцца да тых гурткоў, якія склалі аснову беларускага нацыянальна-культурнага руху – інтэлектуальныя асяродкі А. Кіркора ў Вільні, В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску, А. Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску. Беларуская інтэлігенцыя, якая гуртавалася вакол іх, па сваіх поглядах знаходзілася пераважна на ліберальных пазіцыях.

Сярод дэмакратычнай інтэлігенцыі пачатку 60-х гг. XIX ст. сфарміравалася адносна невялікая група, для якой абсалютна зразумелым было ўяўленне, што Беларусь мае ўсе ўмовы для самастойнага развіцця. Лідэрам гэтай групы быў К. Каліноўскі, які ўскосна выказаў ідэю аб самастойнасці Беларуска-Літоўскай рэспублікі.

Час ад паўстання 1863 г. да рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. склаў новы этап у фарміраванні інтэлігенцыі Беларусі. Разгром паўстання, кардынальныя змены ва ўрадавай палітыцы, буржуазныя рэформы 60–70-х гг. XIX ст. закранулі грамадска-палітычнае, эканамічнае жыццё, інтэлектуальна-духоўную сферу і паўсядзённасць. Расійская рэпрэсіўная палітыка, аформленая пасля падаўлення паўстання 1863 г., значна запаволіла культурна-асветніцкую дзейнасць, фарміраванне палітычных сіл і арганізацый. Гэты супярэчлівы перыяд адкрыў у той жа час магчымасці разняволення чалавечай асобы, да якога б саслоўя чалавек не адносіўся. Набыла свае абрысы ідэя беларускай нацыі, змяніўся характар нацыянальнай самасвядомасці. Пашырэнне беларускай па свайму сёняшняму зместу свядомасці было звязана з дзейнасцю мясцовай народніцкай, а затым сацыял-дэмакратычнай моладзі. Яна не прымала ранейшую «ліцвінскую», «краёвую» ідэалогію, звязаную са шляхецтвам. Абвастраецца барацьба паміж рознымі нацыянальнымі групамі інтэлігенцыі за ўплыў над фарміраваннем грамадзянскай свядомасці шырокіх слаёў насельніцтва. Прадстаўнікі беларускай

інтэлігенцыі, пачынаючы з К. Каліноўскага і А. Кіркора, зведалі нападкі як з боку прадстаўнікоў польскага грамадскага руху, так і расійскага. Першыя абвінавачвалі іх у здрадзе польскім нацыянальным інтарэсам, другія бачылі ў іх асобе замаскіраванага ворага Расіі, які служыць польскім экстрэмістам.

Інтэлектуальнае жыццё ў Беларусі пасля 1863 г. знаходзілася пад пераважным уплывам рускай культуры. Акрамя ўрадавых мерапрыемстваў, гэтаму садзейнічалі змены ў польскім грамадстве, у асяроддзі якога пашырыліся пазітывісцкія ідэалы працы над эканамічным ростам і цывілізацыйным развіццём Польшчы, гарантыяй якой павінна была стаць легальная дзейнасць. Барацьба за нацыянальнае вызваленне адкладвалася на аддаленую перспектыву. Значная частка творчай эліты Беларусі трапіла пад уздзеянне ідэй «заходне-русізму», які на самым пачатку свайго фарміравання як ідэалагічнай плыні меў ліберальна-дэмакратычную афарбоўку, што было звязана са спробай з боку рускамоўнага культурнага асяродку даказаць няпольскасць беларусаў і тым самым аб'ектыўна садзейнічаць актывізацыі вырашэння пытання аб іх этнічным самавызначэнні. Наогул прадстаўнікі ліберальнай плыні «заходне-русізму» ўнеслі значны ўклад у гісторыю і культуру Беларусі, вывучэнне гаспадарчага жыцця, давалі прапановы па рэарганізацыі сельскай гаспадаркі, прамысловасці, сістэмы падаткаабкладання. Нярэдка яны свядома імкнуліся сваёй дзейнасцю палепшыць дабрабыт насельніцтва.

Глыбокія якасныя змены ў фарміраванні інтэлігенцыі адбыліся ў час і пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. З пашырэннем легальнага друку, у тым ліку з'яўленнем беларускамоўнага («Наша доля», «Наша Ніва», пазней «Беларус», «Лучынка» і інш.), распаўсюджваннем прафесійных, грамадска-культурных аб'яднанняў і гурткоў, заснаваннем выдавецкіх суполак, нацыянальных тэатральных калектываў узраслі новыя формы і кірункі інтэлектуальнага жыцця. На гэтым этапе выразна акрэсленымі становяцца розныя этнічныя групы інтэлігенцыі, заўважнай плынню вылучаецца беларуская нацыянальная інтэлектуальная эліта. Апошняй аднак не ўдалося на дадзеным этапе атрымаць дастатковы ўзровень сацыяльнай сталасці, нягледзячы на самаахвярнасць і стварэнне ўласнай палітычнай партыі, для рэалізацыі ў поўнай меры сваіх нацыянальна-палітычных ідэалаў. Разглядаемы перыяд станаўлення беларускай інтэлігенцыі стаў «нашаніўскім», паводле выключнай ролі рэдакцыі газеты ў гуртаванні сіл вакол сябе і ў тэарэтычным асэнсаванні месца інтэлігенцыі ў вырашэнні сацыяльнага і нацыянальнага пытанняў.

Вылучаныя этапы найперш звязаны з гісторыяй беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, але ў асноўным адпавядаюць перыядам развіцця іншых этнічных груп інтэлігенцыі Беларусі, паколькі ўмовы станаўлення былі агульнымі і задачы часам стаялі аднолькавыя. Вывучэнне гісторыі інтэлігенцыі Беларусі знаходзіцца фактычна яшчэ ў зародкавым стане і гэта складаная, комплексная задача, якая патрабуе пераасэнсавання пад адпаведны, у пэўным сэнсе размыты прадмет даследавання назапашанага і пошуку новага матэрыялу па гісторыі навукі, культуры і грамадскага жыцця Беларусі.

### Літаратура


1. Багдановіч М. Новая интеллигенция // Збор твораў: У 2 т. – Мн., 1968. – Т. 2.
2. Довнар-Запольский М.В. История Белоруссии. – Мн., 2003.
3. Жылуновіч З. Беларуская інтэлігенцыя ў гістарычным аспекце // Полымя. – 1926, № 6.
4. Лейкина-Свирская В.Р. Интеллигенция в России во второй половине XIX века. – М., 1971.
5. Овсянико-Куликовский Д. Н. Собрание сочинений. Т. VII. История русской интеллигенции. – СПб., 1914. – Ч. 1.
6. Публицистика белорусских народников. Нелегальные издания белорусских народников (1881–1884) / Сост., подгот. текстов С. Х. Александрович, И. С. Александрович. – Мн., 1983.